***Рачыцкая Я. А.,*** *настаўніца пачатковых класаў Полатаўскай базавай школы Полацкага раёна Віцебскай вобласці*

# Прыстаўка. Правапіс прыставак
# *аб-, ад-, над-, пад-, прад-, перад-*
# Беларуская мова. III клас

***Мэта:*** сістэматызаваць і паглыбіць веды вучняў аб прыстаўцы як частцы слова.

***Задачы:***

- вучыць утвараць новыя словы пры дапамозе прыставак;
- развіваць памяць, лагічнае мысленне і ўвагу вучняў;
- выхоўваць самастойнасць у рабоце, акуратнасць, дысцыплінаванасць, любоў да роднай мовы, роднага краю, да прыроды, чытання.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Беларуская мова» (Свірыдзенка В. І., 2023), ч. 2, «Літаратурнае чытанне» (Жуковіч М. В., 2023), ч. 1, карткі з заданнямі, скарбонка «Добрага настрою», раздрукоўкі да правядзення рэфлексіі, люстэрка.

## І. Арганізацыйны этап.

— Сёння мы адправімся ў незвычайнае падарожжа ў краіну Беларускай мовы. На працягу нашага вандравання мы пабываем у многіх незвычайных месцах. Разам з намі ў падарожжа адправіцца Ластаўка.

— Але спачатку я прапаную кожнаму з вас па чарзе падысці да мяне і зазірнуць у незвычайнаю скарбонку, дзе змешчаны фотаздымак самага працавітага вучня ў класе. (Кожны вучань падыходзіць да скарбонкі, дзе змешчана люстэрка.)

— Ну вось мы і высветлілі, што кожны з вас вельмі працавіты, таму сённяшні ўрок пойдзе на карысць. Давайце ж пачнём наша незвычайнае падарожжа. Разгарніце свае сшыткі і запішыце сённяшнюю дату.

**II. Этап удасканалення каліграфічных навыкаў.**

— Першы прыпынак нашага падарожжа — горад Чыстапісання. Калі ласка, звярніце ўвагу на дошку.

*ай эй ой яй ёй ый*

*зайчык шайба хакей*

— Якое слова лішняе? Чаму?

— Запішыце спалучэнні літар і словы.

— Перад вамі прыказка. Давайце яе прачытаем.

*Век жыві, век вучыся!*

— Як вы яе разумееце?

— Запішыце гэтую прыказку ў свае сшыткі. Пішыце прыгожа, не спяшайцеся.

**III. Моўная размінка.**

— Наступны прыпынак — рака Вымаўлянка. Каб перабрацца праз яе і працягнуць наша падарожжа, трэба правільна вымавіць наступную чыстагаворку:

Паравоз крычыць:
— Ду, ду, ду-у-у!
Да вясны
Іду-іду-іду!
Колы весела бягуць,
Колы песеньку пяюць:
Чах-чах-чах,
Чух-чух-чух,
Ш-ш-ш.

**VI. Слоўнікава-арфаграфічная работа.**

— Ну вось мы і пераплылі раку Вымаўлянку. Зараз трэба дапамагчы жыхарам невялікай вёскі Напісанка. Перад вамі словы, у якія прэба ўставіць прапушчаныя літары.

*В..сна, дож ..., ...ядуля, падб..розавік, мя..кі, ру..нік, з..лёны, надвор..е.*

**V. Этап актуалізацыі ведаў.**

— Перш чым працягваць наша падарожжа, давайце з вамі ўспомнім тое, што мы ўжо вывучылі. Я прапаную вам выканаць тэставае заданне.

***1. З якімі выказваннямі вы згодны?***

а) Прыстаўка — зменная частка слова.

б) Прыстаўка — гэта пастаянная частка слова, якая стаіць перад коранем.

в) Прыстаўка служыць для ўтварэння новых слоў.

***2. У якіх словах ёсць прыстаўка?***

а) узляцеў б) пабег в) гадзіннік г) заспявалі

***3. Выберыце правільнае сцвярджэнне.***

а) Прыстаўка пішацца са словам заўсёды разам.

б) Прыстаўка пішацца са словам асобна.

**VI. Работа па тэме ўрока.**

— Для таго каб даведацца тэму ўрока, трэба выканаць заданне, якое прынесла Ластаўка ў дзюбе.

Канверт з заданнем «Складзі тэму ўрока»: у ім знаходзяцца разрэзаныя літары, з якіх вучням трэба скласці тэму «Правапіс прыставак».

— Сёння на ўроку мы працягнем вывучаць прыстаўку, будзем утвараць новыя словы пры дапамозе прыставак, правільна вымаўляць іх. А яшчэ даведаемся, якія прыстаўкі пішуцца нязменна.

— Выканаем пр. 14 на с. 10 вусна. Звярніце ўвагу, як вымаўляюцца прыстаўкі ў кожнай пары слоў і як пішуцца.

***Праца з падручнікам.***

Знаёмства з правілам на с. 10.

Пр. 16 на с. 11, пісьмова: утварыце магчымыя словы пры дапамозе дадзеных прыставак. Абазначыць корань і прыстаўку.

***Фізкультхвілінка.***

— Выканаем пр. 17, с 12. Прачытайце.

— Пра якія незвычайныя паводзіны ластавак вы даведаліся? Выпішыце выдзеленыя словы, абазначце прыстаўкі.

— Малайцы. Вось мы з вамі на наступнай станцыі — Шыфраванка.

Пр. 19, с. 13: неабходна падабраць словы-антонімы, вызначыць прыстаўкі.

**VII. Замацаванне.**

— Зараз мы з вамі звернемся да нашага падручніка па літаратурнаму чытанню, разгорнем апавяданне Я. Коласа «Ластаўкі» на с. 71 і паспрабуем адшукаць аднакаранёвыя словы да слова *ляцець*. Гэтыя словы трэба выпісаць і выдзеліць у іх прыстаўкі (*прыляцела*, *уляцела*, *прылятал*і).

**VIII. Падвядзенне вынікаў.**

— Падарожжа наша заканчваецца. Час падвесці вынікі. Што вы сёння даведаліся на ўроку? Якія прыстаўкі пішуцца нязменна?

— Малайцы. Усе сёння на ўроку былі актыўнымі, але больш за ўсіх працавалі ... (настаўнік называе імёны найбольш актыўных вучняў).

**IX. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

— Разгарніце, калі ласка, свае дзённікі і запішыце дамашняе заданне (*запісана на дошцы*): пр. 20 на с. 13, правіла на с. 10. Спішыце адну загадку на выбар. Устаўце прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах.

**X. Рэфлексія.**

— У кожнага з вас на парце ляжыць выява ластаўкі. На дошцы вы бачыце нацягнутыя нітачкі — гэта будуць нашы лініі электраперадач, на якіх вельмі часта

можна ўбачыць ластавак. Я прапаную зараз тым, каму ўрок спадабаўся і ўсё было зразумела, размясціць сваю ластаўка на самым верхнім правадочку.

— Калі на ўроку былі цяжкасці і вы лічыце, што трэба яшчэ папрацаваць над дадзенай тэмай, размясціце ластаўку на сярэднім правадочку.

— Калі ўрок не спадабаўся, было вельмі складана і тэма засталася незразумелай, размясціце ластаўку на самым ніжнім правадочку.

— Дзякую за ўрок!